**УДК 94(476)**

# ПОЛАЦКІ КАШТАЛЯН МІКАЛАЙ ШЭМЕТ У ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XVIII СТАГОДДЗЯ

***канд. гіст. навук А. МАЦУК***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі)***

*Даследуецца месца і роль Мікалая Шэмета ў грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай у першай трэці XVIII стагоддзя; робіцца падрабязная рэканструкцыя яго біяграфіі. Заўважана, што апагей дзейнасці Мікалая Шэмета ў грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай прыпадае на пачатак XVIII стагоддзя, калі ён з'яўляўся адным з лідараў "рэспубліканцаў" у Аршанскім павеце. Выяўлена, што гэта стала штуршком для яго кар'еры, якая скончылася на сенатарскім урадзе полацкага кашталяна.*

***Ключавыя словы**: Мікалай Шэмет, Рэч Паспалітая, урад полацкага кашталяна.*

Мікалай Шэмет заслужыў упамінання ў некаторых працах па гісторыі Рэчы Паспалітай першай трэці XVIII ст. Яго біяграфія маецца ў "Польскім біяграфічным слоўніку" [1, S. 156–158]. Гэта біяграфія не здолела зняць усе пытанні наконт жыццёвага шляха Мікалая Шэмета. Некаторыя з гэтых пытанняў былі раскрыты намі ў яго кароткім жыццёвым нарысе ў кнізе пра "Друцк" [2, с. 282–286].

Род Шэметаў пакінуў значны адбітак у грамадска-палітычным жыцці ВКЛ XV–XVII стст., а яго прадстаўнікі шмат разоў напрацягу гэтых стагоддзяў займалі сенатарскія ўрады. Безумоўна, гэта былі не вядучыя ўрады (гетманаў, канцлера ці падканцлера), але ўвесь час хтосьці з прадстаўнікоў рода Шэметаў займаў сенатарскі ўрад. Аднак ужо ў другой палове XVII ст. ніводны прадстаўнік рода Шэметаў не займаў сенатарскага ўрада. Прычынай гэтага было збядненне ўсіх трох вядомых галін рода Шэметаў (ваўкавыскай (на Груску), лідскай (на Дзітве і Вішнёўцы) і аршанскай (на Талачыне і Друцку)). Іх маёмасны статус не даваў магчымасці парадніцца з вядучымі магнацкімі родамі ці зрабіць кар'еру сенатара. Прадстаўнікі рода Шэметаў у асноўным займалі павятовыя ўрады. Адзіным выключэннем да канца існавання Рэчы Паспалітай быў Мікалай Шэмет, які напрыканцы свайго жыцця стаў полацкім кашталянам.

Мікалай Шэмет нарадзіўся каля 1676 г. Ён быў унукам полацкага падстолія Яўстаха і сынам смаленскага стольніка Міхала і Клары з Галімскім Шэметаў. Як бачна, не бацькі, не дзед Яўстах не займалі значных урадаў. Прабабкай Мікалая Шэмета была Ганна Канстанцыя з Сапегаў (жонка віленскага падкаморыя Яраслава Аляксандра Шэмета). Дзякуючы гэтаму падканцлер ВКЛ Казімір Лявон Сапега сваім тэстаментам ад 30 ліпеня 1655 г. запісаў сваім крэўным братам Аляксандру і Яўстаху Шэметам свае ўладанні Талачын, Друцк у Аршанскім павеце і Івашкевічы ў Ваўкавыскім павеце. З іх Яўстаху Шэмету прыпала вялікае ўладанне Талачын, што значна ўзмацніла яго маёмасны стан і паправіла фінансавыя справы. З гэтага часу гэтая галіна рода Шэметаў селіцца ў Талачыне, і галоўная іх дзейнасць разгортваецца ў Аршанскім павеце.

Маці Мікалая даволі рана памёрла і бацька другі раз ажаніўся на Ганне з Шпілоўскіх. Сам бацька Міхал Шэмет памёр паміж 1688 г. і 1691 г. Міхал Шэмет быў не вельмі добрым гаспадаром і пакінуў значныя даўгі. З усіх уладанняў бацькі Яўстаха яму фактычна ўдалося толькі захаваць вялікае ўладанне Талачын, але і тое ён у 1688 г. аддаў на 8 год у заставу віцебскаму скарбніку Аляксандру Адамовічу за 44 тысячы злотых на вельмі нявыгадных умовах. Адразу пасля смерці бацькі Мікалай Шэмет разам з мачахай імкнуліся ліквідаваць такую нявыгадную дамову. За гэта Адамовіч падаў на іх у суд і 1 ліпеня 1691 г. атрымаў трыбунальскі дэкрэт, якім Мікалай Шэмет і яго мачаха былі асуджаны на баніцыю. У адказ Шэметы абвінавацілі Адамовіча ў незаконным трыманні Талочына і пачалі судовую справу супраць яго. У 1693 г. яны атрымалі дэкрэт Трыбунала ВКЛ, якім Адамовіч быў асуджаны на баніцыю. На падставе гэтага дэкрэта Мікалай Шэмет заняў Талочын. Адамовіч бараніў Талочын, і падчас яго заняцця былі прычынены значныя шкоды яго маёмасці, якія былі ацэнены ў 35 тысяч злотых. Абодва бакі дамовіліся вырашыць справу кампрамісам. Па дамове ад 5 чэрвеня 1694 г. Мікалай Шэмет пагадзіўся вярнуць 20 тысяч злотых (з суммы ў 44 тысячы злотых, выплачанай арэнды Адамовічу) [3, k. 259–260 v, 263–264 v]. Паколькі Мікалай Шэмет не мог адразу выплаціць усіх грошай, то было дамоўлена, што ён пакіне ў заставу за 20 тысяч злотых на адзін год Аляксандру Казіміру Адамовічу аддзелены ад Талачына фальварак Серадыкі з 4 сёламі: Мураўнічы, Новае сяло, Стуканы і Пячорава. У выпадку, калі і праз год у Мікалая Шэмета не будзе сродкаў выкупіць фальварк Серадынкі, то ён застаецца ў Адамовіча яшчэ на тры гады, а тэрмін заставы працягваецца на наступныя тры гады да таго часу, пакуль Мікалай Шэмет не выкупіць гэтыя ўладанні [3, k. 261–262 v, 265–265 v]. Гэтых станоўчых перамоў ў дамове з Адамовічам Мікалаю Шэмету ўдалося дасягнуць дзякуючы дапамозе мачыхі, адносіны з якой у Шэмета скаліся

вельмі добра. У выніку нават мачаха Ганна з Шпілоўскіх, незадоўга да сваёй смерці, 4 красавіка 1694 г. даравала Мікалаю Шэмету 40 тысяч злотых, якія Міхал Шэмет запісаў ёй на Талочыне, што дапамагло пазбегнуць значных фінансавых выдаткаў [4, k. 76–77 v, 78–79 v].

У 1700 г. Мікалай Шэмет жаніўся на Тэрэзе з Совічаў Корсакаў, якая была дачкой наваградскага падкаморыя Аляксандра Міхала Совіча Корсака і наваградскай ваявадзянкі Ефразініі з Палубінскіх). Гэта была вельмі ўдалая жаніцьба, бо родзічы Тэрэзы мелі значныя ўплывы ў ВКЛ. Праўда, асноўная іх дзейнасць праходзіла ў Наваградскім ваяводстве. Мелі яны значныя ўладанні і ў Аршанскім павеце, а дакладней былі ўладальнікамі недалёка размешчаных ад Талачына значных уладанняў: Вечежанкі з сёламі Яблонка і Ляшчанка, а таксама Вялікай Аравы. Такім чынам, Шэмет атрымліваў не толькі эканамічную, але і палітычную карысць, дзякуючы падтрымцы Совічаў Корсакаў у Аршанскім павеце.

У прыданае жонка Мікалая Шэмета атрымала 24 тысячы злотых і застаўнае права на Мікадзінаў у Аршанскім павеце яшчэ на 24 тысячы злотых. Акрамя таго, Тэрэза з Совічаў Корсакаў атрымала ўпрыгожванняў, срэбра і іншай маёмасці на 20 тысяч злотых. У сваю чаргу Мікалай Шэмет даў сваёй будучай жонцы 40 тысяч злотых, 22 чэрвеня 1700 г. запісаў ёй на Талочыне 80 тысяч злотых. 21 чэрвеня 1701 г. Тэрэза з Совічаў Корсакаў падарыла свайму мужу раней запісаную ёй сумму на Талачыне. Замест гэтага Мікалай Шэмет запісаў ёй 50 тысяч злотых і ўсю маёмасць. Пры адсутнасці нашчадкаў усе ўладанні Мікалая Шэмета мелі трапіць да жонкі [5, k. 1529–1530 v, 1531–1532 v, 1533–1534 v, 1535–1536 v, 1537–1538 v]. 7 снежня 1713 г. Мікалай Шэмет пацвердзіў сваёй жонцы запіс Талочына і адначасова запісаў ёй 30 тысяч злотых на гэтым уладанні. Усе вайсковыя рэчы мелі атрымаць яго родзічы, стрыечныя браты: Аляксандр Мальхер, Бенедыкт, Францішак і Ян (Януш) Шэметы.

У канцы XVII ст. у ВКЛ разгарнулася барацьба шляхты і часткі магнатэрыі супраць гегемоніі Сапегаў. Гэты рух атрымаў назву “рэспубліканцаў”. Вялікая колькасць прыхільнікаў гэтага руху была ў Аршанскім павеце. Актыўна ў ім удзельнічаў Мікалай Шэмет, які стаў адным з лідараў “рэспубліканцаў” у Аршанскім павеце. Менавіта прыналежнасць да “рэспубліканцаў” дала магчымасць Мікалаю Шэмету зрабіць выдатную кар’еру. Як аршанскі ротмістр ён быў на чале адной з пяці харугваў Аршанскага павета, якія 18 лістапада 1700 г. удзельнічала ў бітве з войскамі Сапегаў пад Алькенікамі. Пасля перамогі ў гэтай бітве разам з іншымі “рэспубліканцамі” 24 лістапада 1700 г. ён падпісаў “Генеральнае пастанаўленне Станаў ВКЛ” [1, S. 156]. Пераможцы сталі займаць сапежынскія ўладанні. Вялікая іх колькасць знаходзілася ў Аршанскім павеце (Стары і Новы Быхаў, Дуброўна, Чарэя, Беліца, Горы, Горкі, Баркалабава, Дашкоўка, Буйнічы). Дастаткова сказаць, што Сапегам у павеце належыла 39 працэнтаў усіх сялянскіх дымоў. У адказ на дзеянні “рэспубліканцаў” у гэтых уладаннях успыхнула паўстанне. Тайна яго падтрымлівалі і Сапегі. Мясцовыя “рэспубліканцы” былі вымушаны абараняцца. Пасля вяртання ў Аршанскі павет, Мікалай Шэмет 7 лютага 1701 г. быў абраны дэпутатам на Трыбунал ВКЛ і павятовым ротмістрам. Ужо на гэтым сойміку аршанская шляхта шмат увагі ўдзяліла злоўжываванням ў Аршанскім павеце сапежынскай адміністрацыі Старога Быхава, які стаў цэнтрам паўстання [6, с.17; 7, арк. 120 адв]. З 1701 г. Мікалай Шэмет пачынае называцца аршанскім стольнікам, але гэты ўрад ён атрымаў пазней. Напэўна Аўгуст II надаў гэты ўрад у падзяку за падтрымку. Магчыма, праўда, і іншая версія: ён не атрымліваў гэтага ўраду, а проста тытулаваўся аршанскім стольнікам. Канфлікт з паўстаўшымі падданымі Сапегаў толькі ўзмацняўся. Вясной 1701 г. прыхільнікі Сапегаў са Старога Быхава перайшлі ў наступленне. 31 красавіка 1701 г. яны разбілі атрад “рэспубліканцаў” пад Новым Быхавам. З гэтага часу “выступленне прыхільнікаў Сапегаў набывае характар паўстання з удзелам як шляхты, так і сялян”. У маі 1701 г. імі былі заняты Горы, Горкі, Дуброўна. Паўстанне не дасягнула Талачына, але прынесла непасрэдныя шкоды Мікалаю Шэмету, бо ў яго трыманні была частка горацкіх уладанняў. “Рэспубліканцы” пасля перамогі пад Алькенікамі захавалі правы застаўнікоў на сапежынскія ўладанні, але іх не прызнавалі сапежынскія прыхільнікі. У ліпені 1701 г. “рэспубліканцы” пачалі наступленне на сілы паўстанцаў. Паспалітае рушанне Аршанскага павета мела сабрацца 30 ліпеня 1701 г. Мікалай Шэмет як ротмітстр павінен быў кіраваць адной з яго харугваў. Аднак яшчэ да яго збору, 26 ліпеня 1701 г., войска “рэспубліканцаў” на чале з Казімірам Пацеем разбіла атрад паўстанцаў пад кіраўніцтвам Каршы пад Дуброўнам. “Рэспубліканцы” захапілі ўсё Дубровенскае графства, устанавілі кантроль і над Горамі, частка якіх была ў заставе ў Шэмета. Аршанская шляхта не прымала актыўнага ўдзелу ў атрадах “рэспубліканцаў”. Новы тэрмін склікання паспалітага рушання быў вызначаны на сне-жань 1701 г., але “фактычна быў сарваны з-за саперніцтва дзвюх варагуючых груповак” [6, с. 18–19]. Прычынай быў канфлікт аршанскага віцэ-палкоўніка і аршанскага скарбніка Самуэля Цеханавецкага з аршанскімі ротмістрамі на чале з Казімірам Стэткевічам, якога падтрымліваў і іншы ротмістр Мікалай Шэмет. Харугвам Стэткевіча і Шэмета было загадана ўніверсалам Цеханавецкага рушыць да Аранцэвічаў, але сам віцэ-палкоўнік не з’явіўся тут. Праўда, Стэткевічу і Шэмету быў дасланы загад змяніць месца дыслакацыі – перамясціцца да Беліцы і часткі іншага ўладання Сапегаў – Чарэі. Тут да іх дайшоў новы загад Цеханавецкага аб роспуску гэтых харугваў. Прычынай Цеханавецкі называў бяздзейнасць Стэткевіча

супраць паўстанцаў і вырашэнне ўласных прыватных спраў з дапамогай харугвы паспалітага рушання. Стэткевіч і Шэмет вырашылі не падпарадкоўвацца такому загаду. Яны лічылі неабходным захаваць свае харугвы для барацьбы з паўстанцамі і 20 снежня 1701 г. выдалі адпаведны маніфест. Лідарам выступлення супраць Цеханавецкага быў Казімір Стэткевіч. Мікалай Шэмет цалкам падтрымліваў яго ў гэтай барацьбе, што павялічыла кола яго прыхільнікаў сярод “рэспубліканцаў” [6, с. 19; 7, арк. 834а-835адв, 877-878].

Менавіта яны дамагліся перамогі над прыхільнікамі Цеханавецкіх на грамнічным аршанскім сойміку 1702 г., а іх лідар Казімір Стэткевіч быў абраны палкоўнікам Аршанскага павету. Мікалай Шэмет не прысутнічаў на гэтым сойміку, але, як можна меркаваць, быў задаволены яго вынікамі, бо гэта давала яму магчымасць застацца аршанскім ротмістрам і захаваць сваю харугву. Сілаў войска “рэспубліканцаў” не хапала, каб нанесці паўстанцам рашаючае паражэнне. Цэнтрам паўстання заставаўся ўмацаваны Стары Быхаў. Мікалай Шэмет прысутнічаў на аршанскім сойміку 30 мая 1702 г. на якім было прынята рашэнне абараняць караля Аўгуста II у вайне са Швецыяй, а ў дапамогу генеральнаму палкоўніку ВКЛ Міхалу Вішнявецкаму сабраць панцырную харугву (120 коней). 12–13 чэрвеня 1702 г. аршанская шляхта сабралася на паспалітае рушанне пад Лесунамі, дзе абрала Мікалая Шэмета адным з павятовых ротмістраў. Гэты выбар быў пацверджаны на чарговым з’ездзе ў Оршы (6 ліпеня 1702 г.). Мікалай Шэмет таксама ўдзельнічаў у з’ездзе паспалітага рушання 27–29 ліпеня 1702 г. пад Галоўчынам паміж Лазіцамі і Смятанічамі, сабранага на падставе лімітаванага з’езда ў Оршы [7, арк.1080; 8, с. 261–263]. Лёс паўстання тым часам быў вырашыны без удзелу аршанскага паспалітага рушання, а з дапамогай “рэспубліканцам” расійскіх войскаў, якія ў красавіку 1702 г. увайшлі ў ВКЛ. Пасля доўгай асады 10 лістапада 1702 г. Быхаў капітуляваў [6, с. 19–20]. З яго капітуляцыяй супакоілася і сітуацыя ў Аршанскім павеце.

У 1703 г. Мікалай Шэмет быў абраны дырэктарам грамнічнага сойміка ў Оршы. 13 чэрвеня 1703 г. Мікалай Шэмет прысутнічаў на аршанскім пасольскім сойміку, у ліпені 1703 г. як ротмістр кіраваў адной з харугваў на паспалітым рушанні аршанскай шляхты. Яго ўплывы сярод аршанскай шляхты толькі ўзрасталі, і ў 1704 г. ён быў абраны павятовым палкоўнікам [9, арк. 1811адв]. Мікалай Шэмет прысутнічаў на наступным аршанскім пасольскім сойміку ў чэрвені 1704 г., дзе аршанская шляхта абрала паслоў да караля Аўгуста II і вялікага гетмана ВКЛ Міхала Вішнявецкага. Прысутнічаў таксама на аршанскім сойміку 18 снежня 1704 г., дзе абмяркоўваліся падаткі расійскае войска, якое прыйшло на дапамогу “рэспубліканцам” і Аўгусту II. Да яго далучылася і расійскае войска, якое пасля асады Дэрпта і Нарвы рушыла на зімовыя кватэры пад Смаленск як раз праз Аршанскі павет. З невядомых прычынаў Мікалай Шэмет не падпісаў інструкцыю паслам да вялікага гетмана ВКЛ Міхала Вішнявецкага, што былі абраны на гэтым сойміку. Будучы павятовым палкоўнікам, Мікалай Шэмет ад імя Аршанскага павета праводзіў перамовы з расійскімі войскамі, якія ўвайшлі ў ВКЛ на дапамогу “рэспубліканцам”. 17 мая 1705 г. як павятовы палкоўнік Мікалай Шэмет выдаў універсал для збора правіянта для расійскіх войск пад кіраўніцтвам расійскага генерал-фельдмаршала Барыса Шарамецьева [10, арк. 400]. Шэмет прысутнічаў на сойміку 24 верасня 1705 г., дзе вырашалася пытанне збору правіянта для расійскіх войск. Гэтую праблему не ўдавалася вырашыць цалкам, і аршанская шляхта ўвесь час мусіла збірацца на соймікі для вызначэння новых падаткаў і збора правіянта для расійскіх войск. Яна знаходзілася ў цэнтры ўвагі і Мікалая Шэмета, як павятовага палкоўніка. Менавіта ён сваімі ўніверсаламі склікаў аршанскі соймік 4 студзеня 1706 г., дзе павінна было разглядацца пытанне вызначэння і збора правіянта для расійскіх войск. У 1706 г. расійскія войскі апасаліся руху шведскіх войск і “сапежынцаў”, якія размясціліся ў Мінскім ваяводстве, але тыя рушылі ў Карону. Расійскія войскі размясцілі свае атрады ў Аршанскім павеце: Оршы, Магілёве, Шклове і іншых месцах. З гэтага часу расійскія войскі ўвесь час дыслацыраваліся ў Аршанскім павеце. Гэта прынесла мясцовай шляхце вялікія выдаткі на забеспячэнне гэтых войск, але і садзейнічала таму, што ў гэтым павеце прыхільнікі Сапегаў не мелі магчымасці арганізаваць ніякіх сваіх атрадаў. Абвастрылася сітуацыя ў Аршанскім павеце толькі ў 1708 г., калі на ўсход ВКЛ па шляху ў Расію рушыла шведскае войска [11, с. 79–80, 95; 12, s. 547–549].

У Паўночнай вайне Мікалай Шэмет, як і ішыя “рэспубліканцы”, застаўся верным Аўгусту II і ваяваў супраць прыхільнікаў Станіслава I Ляшчынскага і шведскіх войск у ВКЛ. З іншых “рэспубліканцаў” Мікалай Шэмет найбольш зблізіўся з родам Валовічаў з Мсціслаўскага ваяводства. У 1711 г. ён быў паручыкам гусарскай харугвы маршалка ВКЛ Марціна Валовіча. Сам Шэмет валодаў моцным уплывам ў войске ВКЛ і ўжо ў 1712 г. ён быў рэгіментарыям “беларускай дывізіі”. 11 мая 1713 г. на аршанскам элекцыйным сойміку Шэмет быў абраны адным з кандыдатаў на ўрад аршанскага падкаморыя. Яго канкурэнтамі былі аршанскі стольнік Дамінік Хлявінскі, аршанскі падстароста Антоній Галімскі і аршанскі памежны суддзя і аршанскі ротмістр Ян Кіркор. Безумоўна Шэмет быў кандыдатам, які меў найбольш шанцаў атрымаць каралеўскі прывілей на гэты ўрад, што і адбылося ўжо 24 мая 1713 г. [13, арк. 920]. 5 лютага 1714 г. аршанская шляхта на грамнічным сойміку абрала яго адміністратарам шалезнага і чопавага падаткаў [14, арк. 48]. У 1713 г. Мікалай Шэмет стаў паручыкам гусарскай харугвы

аднаго з лідараў прыдворнай партыі падканцлера ВКЛ Казіміра Чартарыйскага. Нягледзячы на гэта Мікалай Шэмет захаваў добрыя адносіны з вялікім гетманам ВКЛ Людвікам Пацеем, які быў лідарам антыкаралеўскай апазіцыі ў Княстве. Пацей у мае-чэрвене 1714 г. паўторна прызначае Мікалая Шэмета рэгіментарыям "беларускай дывізіі" войска ВКЛ. Мікалай Шэмет прысутнічаў на аршанскім грамнічным сойміку 1715 г. На гэтым сойміку былі абраны паслы да вялікага гетмана ВКЛ аршанскі скарбнік Дамінік Амброк і аршанскі лоўчы Ян Кураш. Па задумцы Пацея, яны мелі паказаць каралеўскаму двару яго ўплывы, а незадаволенай прысутнасцю саксонскіх войскаў шляхце – падтрымку з боку вялікага гетмана і войска ВКЛ. Мікалай Шэмет, напэўна, не хацеў абвастраць адносіны з каралеўскім дваром і таму прысутнічаў на аршанскім грамнічным сойміку 1715 г., але не падпісаў інструкцыі паслам да вялікага гетмана ВКЛ. Сувязі адначасова з каралеўскім дваром і вялікім гетманам ВКЛ Людвікам Пацеем абумовілі тое, што Мікалай Шэмет не прымаў актыўнага ўдзелу ў Тарнаградскай канфедэрацыі ў 1715–1717 гг., бо яна выступала супраць прысутнасці саксонскіх войск у Рэчы Паспалітай і ў асноўным была накіравана супраць каралеўскага двара і гетманаў [1, S. 157]. Дзейнасць Шэмета абмежавалася межамі Аршанскага павета. Ён прысутнічаў на аршанскім грамнічным сойміку 1716 г. Разам з іншай аршанскай шляхтай сабраўся 20 сакавіка 1716 г. на соймік, дзе былі абраны паслы на Віленскі з'езд і да вялікага гетмана ВКЛ. Магчыма пад уплывам Шэмета аршанская шляхта, у адрозненні ад іншых паветаў, працягвала ў Пацеі бачыць абаронцу сваёй вольнасці, які ў гэты час упарадкаваў усе свае справы з каралеўскім дваром і таму перашкаджаў стварэнню канфедэрацый. Праўда, пад націскам шляхты Пацей быў вымушаны пакарыцца патрабаванням шляхты стварыць канфедэрацыю [14, арк. 887-887адв, 913-914адв, 941-942].

Дзякуючы каралеўскаму двару ўжо ў 1717 г. Мікалай Шэмет стаў паручыкам гусарскай харугвы каралевіча Фрыдэрыка Аўгуста, якая даслацыравалася ў Полацку. На аршанскім рэляцыйным сойміке 15 сакавіка 1717 г. разам з кухмістрам ВКЛ Каралем Залускім Мікалай Шэмет быў абраны камісарам для верыфікацыі тарыфа і збора падаткаў у Аршанскім павеце. Гэта аказалася няўдзячнай працай, бо супраць дзейнасці камісіі былі занесены шматлікія пратэстацыі, а Шэмета і іншых удзельнікаў абвінавачвалі ў злоўжываннях і фальсіфікацыях [15, арк. 168-169адв].

Мікалай Шэмет даволі ўдала павялічваў свой маёнтак. Аўгуст II надаў яму велятыцкае староства ў Аршанскім павеце. 10 студзеня 1717 г. лідар прыдворнай партыі Казімір Чартарыйскі перадаў Мікалаю Шэмету дзяржавы Палепе, Кашолкі, Ленча, Прэйкопы і Служы ў Жамойці. Праз два гады Шэмет перадаў гэта ўладанне Жыгімонту Карпу. 3 сакавіка 1720 г. Аўгуст II дазволіў на передачу Шэмету грунта Вірыдымава ў Наваградскім ваяводстве. Шэмет экспартаваў збожжа і лясныя тавары. Для гэтага выкарыстоўваў раку Заходнюю Дзвіну (праз Рыгу) і Нёман (праз Кралявец) [1, S. 157].

22 жніўня 1718 г. Мікалай Шэмет у Оршы быў абраны паслом на сойм 1718 г. Гэты сойм зацвердзіў Варшаўскую дамову 1716 г. паміж каралём і сканфедэраванай шляхтай, а таксама пастановы Нямога сойма 1717 г. Разам з іншымі соймавымі пасламі патрабаваў вывад расійскіх войскаў з Рэчы Паспалітай. Расійскаму паслу Рыгору Даўгарукаму ўдалося падкупіць калегу Шэмета Марціна Фларыяна Корбута, каб той сарваў сойм. Аднак каралеўскія прыхільнікі перакупілі Корбута, і сойм не быў сарваны [15, арк. 743-743адв; 16, p.898; 17, p.3v; 18, с. 36]. Невыключана, што свайго калегу ім дапамог пераканаць і Мікалай Шэмет. Прысутнасць на сойме 1718 г. мела нечаканыя наступствы для Шэмета. Дзякуючы яму ён апраўдаўся перад шляхтай супраць абвінавачванняў аршанскіхураднікаў аб кражы грошай, якія былі сабраны з падатку з Аршанскага павета згодна ўніверсалу Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ 1716 г. Мікалай Шэмет прыняў удзел і ў наступным сойме 1719–1720 гг., які быў скліканы з тым жа складам паслоў (акрамя тых павятовых пасольскіх соймікаў 1718 г., якія былі сарваны). Яшчэ раней на аршанскім грамнічным сойміку 1719 г. мясцовая шляхта пацвердзіла пасольскія паўнамоцтвы Шэмета і Корбута. На гэтым жа сойміку была вызначына ім пасольшчына: 6 тысяч злотых Шэмету і 5 тысяч злотых Корбуту [19, к. 29]. Мікалай Шэмет прысутнічаў на аршанскім грамнічным сойміку 1724 г. На аршанскім пасольскім сойміку 1724 г. падчас выбара дырэктара сойміка дайшло да канфлікта паміж шляхтай. Прычынай быў канфлікт аршанскай шляхты з мясцовамі ўраднікамі на чале з падкаморыям Мікалаям Шэметам і харужым Казімірам Стэткевічам. У выніку соймік быў сарваны. Пасля ўдалося дайсці да згоды і пры дырэкцыі лідара варожай групоўкі Юзафа Лукомскага на паўторным аршанскім сойміку 20 верасня 1724 г. адным з паслоў быў абраны Мікалай Шэмет. Прысутнічаў Мікалай Шэмет на аршанскім грамнічным сойміку 1726 г., які скончыўся паспяховым выбарам дэпутатаў смаленскага стольніка Юзафа Галінскага і бецкага старосты Аляксандра Юзафовіча [20, арк. 536–537адв, 538–539адв; 21, p. 35–39v; 22, k. 421v]. Як пасол на сойм 1724 г. удзельнічаў Мікалай Шэмет і ў сойме 1726 г., які быў соймам з ліміты. На гэтым сойме 12 кастрычніка 1726 г. Мікалай Шэмет атрымаў урад полацкага кашталяна. Як сенатар Мікалай Шэмет быў вызначаны ў склад камісіі для перамоў з Прусіяй. [1, S. 157]. Нажаль, невядома за якія заслугі Мікалай Шэмет атрымаў сенатарскі ўрад полацкага кашталяна. Гэты ўрад быў вольным пасля смерці ў 1725 г. полацкага кашталяна Крыштафа Канстанціна Паца. Менавіта ў гэты час адбыліся перамены сярод полацкай эліты. У двадцатых лічбах мая 1725 г. у Полацку адбыліся элекцыйныя соймікі

па выбару полацкіх земскіхураднікаў: падкаморыя, харужага, земскага суддзі, падсудка і пісара [23, арк. 273]. Ужо 6 чэрвеня 1726 г. на ўсе вышэй пералічаныя ўрады былі выдадзены прывілеі [24, с. 396–404; 25, k. 1580-1583v, 1602-1603v]. Самым уплывовым з вышэйшых земскіхураднікаў у Полацкім ваяводстве быў Антоній Зяновіч, але выбар яго кандыдатуры на ўрад полацкага кашталяна быў малаверагодным. Тым больш, што нядаўна ён стаў полацкім падкаморыям. У такім выпадку каралеўскі выбар паў на Мікалая Шэмета, нягледзячы на тое, што ён не меў ніякіх уладанняў у Полацкім ваяводстве. Адзінае, што яго звязвала з Полацкім ваяводствам гэта тое, што ў гэтым ваяводстве дыслацыравалася харугва каралевіча Фрыдэрыка Аўгуста, дзе Шэмет служыў. У такім выпадку самым лагічным тлумачэннем прызначэння Шэмета полацкім кашталянам бачыцца прыналежнасць яго да каралеўскай групоўкі.

У 1727 г., не жадая рабіць рэляцыю з соймаў 1724 і 1726 гг., разам з афіцэрамі сваёй харугвы сарваў дэпутацкі, рэляцыйны і гаспадарчы соймікі. Другой прычынай зрыву соймікаў быў канфлікт Шэмета з мясцовай шляхты наконт фальсіфікацыі тарыфа Аршанскага павета 1717 г. З-за гэтага аршанская шляхта мела плаціць зывышаныя падаткі. Шляхта з гэтым не згаджалася і хацела зверыць гэты тарыф з тарыфам Аршанскага павета 1690 г., але той быў у Шэмета і ён не хацеў яго выдаваць [26, арк. 23–24]. У выніку, на наступным грамнічным сойміку (9 лютага 1728 г.) аршанская шляхта прыняла пастанову забраць у Мікалая Шэмета тарыф Аршанскага павета 1690 г., які ён трымаў яшчэ з 1717 г. [27, арк. 413–414адв]. Нягледзячы на такія выступленні супраць сябе часткі мясцовай шляхты, Шэмет увесь час валодаў значным уплывам у Аршанскім павеце. 21 жніўня 1730 г. Шэмет быў абраны дырэктарам аршанскага пасольскага сойміка, дзе пасламі былі падстолій ВКЛ Міхал Антоні Патоцкі і аршанскі гродскі староста Аляксандр Юзафовіч. Напэўна не без ініцыятывы Шэмета на гэтым жа сойміку былі абраны пасламі аршанскі скарбнік і аршанскі ротмістр Міхал Піятроўскі і аршанскі канюшы Павел Длускі да нова-прызначанага генеральнага рэгіментарыя ВКЛ Міхала Вішнявецкага. Гэтым паслам Мікалай Шэмет падпісаў і інструкцыю, у якой заклікалася надаць урад вялікага гетмана ВКЛ менавіта Міхалу Вішнявецкаму [28, арк. 280, 303-303адв]. На карысць гэтай думкі кажа тое, што адразу пасля смерці вялікага гетмана ВКЛ Людвіка Пацея Мікалай Шэмет актыўна пачаў супрацоўнічаць з генеральным рэгіментарыям ВКЛ Міхалам Вішнявецкім, які ўзначальваў магнацкую групоўку Радзівілаў. Адпаведна Шэмет пачаў супрацоўнічаць з магнацкай групоўкай Радзівілаў. У лютым 1731 г. па просьбе Радзівілаў Шэмет пільнаваў аршанскі грамнічны соймік. 3 чэрвеня 1731 г. загадаў занесці ў аршанскія гродскія кнігі ўніверсал канцлера ВКЛ і генеральнага рэгіментарыя ВКЛ Міхала Вішнявецкага, які датычыўся абароны “нойбургскіх уладанняў” перад магчымым захопам Сапегаў. 2 жніўня 1728 г. у Гданьску памірае полацкі ваявода Станіслаў Дэнгоф, і Мікалай Шэмет становіцца вышэйшым мясцовым ураднікам. Да гэтага часу Шэмет набыў неабходную палітычную вагу ў полацкай шляхты, якая на полацкім грамнічным сойміку 1732 г. разглядала магчымасць абраць да яго паслоў па ўніверсал на правядзенне элекцыйнага сойміка па выбару полацкага падкаморыя [28, с. 99].

Пасля смерці Аўгуста II (1 лютага 1733 г.) Мікалай Шэмет не прымаў актыўнага ўдзелу ў падзеях бескаралеўя. З невядомых прычынаў Мікалай Шэмет не быў 18 сакавіка 1733 г. на аршанскім перадканвакацыйным сойміку. Таксама Шэмет не прысутнічаў у Варшаве на элекцыйным сойме 1733 г., які абраў каралём Станіслава I Ляшчынскага. Не быў Шэмет і ў варшаўскім прадмесці Празе на абранні каралём 5 кастрычніка 1733 г. праціўніка Ляшчынскага саксонскага курфюрста Фрыдэрыка Аўгуста пад імём Аўгуста III [1, S. 157]. Фактычна атрымалася, што Шэмет займаў нейтральную пазіцыю. Гэта давала Шэмету магчымасць бараніць свае ўладанні перад расійскімі войскамі і атрадамі прыхільнікаў Аўгуста III і Станіслава Ляшчынскага. Большасць аршанскай шляхты выказалася на баку Станіслава I Ляшчынскага, але магнацкія пратэктары Шэмета Радзівілы былі на баку Аўгуста III, а Міхал Вішнявецкі нават узначаліў групоўку яго прыхільнікаў у Княстве. Нейтральнасці Шэмета дапамагала і тое, што канфедэрацыя прыхільнікаў Ляшчынскага да сакавіка 1734 г. адсутнічала ў Аршанскім павеце. Прыхільнікі Ляшчынскага ў Аршанскім павеце падазравалі Шэмета ў скрытай падтрымцы Аўгуста III. Іх лідар аршанскі гродскі староста 3 красавіка 1734 г. прыказаў сваім падначаленым прывезці Шэмета ў Оршу з “ушанаваннем сенатарскага гонару” для складання прысягі на вернасць Станіславу I [30, л. 95]. Напэўна, Юзафовіч меў памылковыя звесткі наконт месцазнаходжання Шэмета, бо той ужо 5 красавіка 1734 г. падпісаў у Вільні акт Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ [31, s. 380]. Да канца не зразумелы прычыны, якія вымусілі Шэмета адкрыта выказацца на баку Станіслава Ляшчынскага. Магчыма такім спосабам Мікалай Шэмет імкнуўся абараніць свае ўладанні перад прыхільнікамі Ляшчынскага. Яшчэ адной прычынай бачыцца знаходжанне ў шэрагах прыхільнікаў Станіслава I Ляшчынскага большасці аршанскай шляхты, і Шэмет, калі хацеў захаваць сваю папулярнасць сярод яе, меў таксама падтрымаць кандыдатуру Ляшчынскага.

Восенню 1735 г. Мікалай Шэмет атрымаў навіну, што яго лічуць памершым і таму чын паручніка каралеўскай гусарскай харугвы нададзены іншаму. Гэта прымусіла Шэмета выехаць на сойм да Варшавы. Аднак па дарозе ён монца захварэў і спыніўся ў Кублічах у Полацкім ваяводстве. Адтуль 30 каст-

рычніка 1735 г. прасіў дапамогі ў троцкага кашталяна і польнага гетмана ВКЛ Міхала Казіміра Радзівіла і ў караля вярнуць чын паручніка каралеўскай гусарскай харугвы. Да хворага Шэмета ў Куюлічы прыбылі яго родзічы: аршанскі падчашы Аляксандр Мальхер і наваградскі скарбніковіч Геранім Шэметы. Ім удалося пераканаць Мікалая Шэмета змяніць ранейшыя свае запісы на карысць жонкі. 11 лістапада 1735 г. яны атрымалі ад яго дароўны запіс, а 8 снежня 1735 г. згодна складзенаму тэстаменту ён перадаў ім усе свае ўладанні. Гэта супярэчыла ранейшым запісам усіх уладанняў жонцы і стала прычынай далейшай шматгадовай судовай справы. Сам Мікалай Шэмет памёр у Кублічах 26 снежня 1735 г. [1, S. 157].

Такім чынам, Мікалай Шэмет пражыў каля шасцідзесяці гадоў, паказаў сябе добрым гаспадаром. Атрымаўшы ў спадчыну вялікае ўладанне Талочын, якое было застаўлена з-за даўгі, Мікалай Шэмет не толькі выплаціў гэтыя даўгі, але і павялічыў колькасць сваіх уладанняў. Жаніцьба на Тэрэзе з Совічаў Корсакаў парадніла Шэмета з родам, які меў моцныя ўплывы ў Наваградскім ваяводстве і Аршанскім павеце. Апагей актыўнасці Мікалая Шэмета ў грамадска-палітычным жыцці ВКЛ прыпадае на пачатак XVIII ст., калі ён быў адным з лідараў “рэспубліканцаў” у Аршанскім павеце ў іх вайне супраць Сапегаў. Прыналежнасць да “рэспубліканцаў” дала магчымасць у далейшым атрымаць новыя афіцэрскія чыны ў войску і ўрады. Ён зрабіў даволі ўдалую кар’еру – дасягнуў сенатарскага ўрада полацкага кашталяна. Для параўнання яго дзед і бацька мелі нязначныя павятовыя ўрады: полацкага падстолія і смаленскага стольніка. Безумоўна Мікалай Шэмет уваходзіў у павятовую эліту Аршанскага павета, дзе займаў адзін з вышэйшых урадаў – падкаморыя. Двойчы (у 1718 і 1724 гг.) Мікалай Шэмет абіраўся ў Оршы паслом на сойм. Соймы 1718 і 1724 гг. былі лімітаваны, што дало магчымасць Шэмету прыняць удзел у чатырох соймах: 1718, 1719–1720, 1724, 1726 гг. На апошнім з іх Мікалаю Шэмету быў нададзены ўрад полацкага кашталяна. Сам Мікалай Шэмет быў слаба звязаны з Полацкім ваяводствам, і атрыманне гэтага ўрада стала магчыма дзякуючы двум прычынам. Па-першае, падтрымкі каралеўскага двара. Па-другое, адсутнасці моцнага канкурэнта на гэты ўрад з боку мясцовай павятовай эліты. Да гэтага часу Мікалая Шэмета з Полацкім ваяводствам звязвала толькі тое, што ён быў паручнікам харугвы каралевіча Фрыдэрыка Аўгуста, якая дыслацыравалася ў Полацку, і праз гэту тэрыторыю экспартаваліся тавары ў Рыгу з яго уладанняў у Аршанскім павеце. Пасля смерці 2 жніўня 1728 г. полацкага ваяводы Станіслава Дэнгофа менавіта Мікалай Шэмет становіцца першымураднікам Полацкага ваяводства і застаецца ім да смерці.

ЛІТАРАТУРА


1. Haratym, A. Szemioth Mikołaj Józef / A. Haratyn, A. Matsuk // Polski Słównik Biograficzny. – Warszawa; Kraków, 2012. – T. XLVIII/1, z. 196. – S. 156–158.
2. Мацук А.У. Владения рода Шеметов и Сангушек и участие их представителей в общественно-политической жизни Речи Посполитой XVII – XVIII ст. // Друцк: Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX–XII вв., летопись древних слоев, князья Друцкие и их владения в XIII – XVIII вв., ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников), памятники культуры и объекты туризма / О.Н. Левко [и др.] ; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О.Н. Левко. – Минск, 2014. – С. 270–290.
3. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 39.
4. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 43.
5. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 48.
6. Віцько, Д. Паўстанне на ўсходзе Беларусі ў 1701–1702 гг. / Д. Віцько // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 4. – С. 15–21.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 2.
8. Віцько, Д. Зборы паспалітага рушэння шляхты ВКЛ у 1702 г. / Д. Віцько // Вялікае княства Літоўскае і суседзі. Права. Вайна. Дыпламатыя / рэд. С. Сокал, А. Янушкевіч. – Мінск, 2012. – С. 255–287.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 3.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 4.
11. Заозерский, А. Фельдмаршал Б.П. Шереметев / А. Заозерский. – М., 1989.
12. Burdowicz-Nowicki, J. Piotr I, August II i Rzeczpospolita 1697–1706 / J. Burdowicz-Nowicki. – Kraków, 2010.
13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 6.
14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 7.
15. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 8.
16. Lietuvos mokslų akademijos biblioteka. – F. 17. Op.1. B. 177.
17. Lietuvos mokslų akademijos biblioteka. – F. 148. Op.1. B. 79.
18. Kosińska, U. Sejm 1719–1720 a sprawa ratyfikacji traktatu wiedeńskiego / U. Kosińska. – Warszawa, 2003.
19. Lietuvos mokslų akademijos biblioteka. – F. 17. Op.1. B. 68.
20. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 9.
21. Lietuvos mokslų akademijos biblioteka. – F. 17. Op.1. B. 52.
22. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 77.
23. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 17.
24. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – КМФ-18. № 165.

25. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 81.
26. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 10.
27. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 11.
28. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 15.
29. Мацук, А. Полацкае ваяводства ў XVIII ст.: ваявода, шляхецкая эліта, соймікі / А. Мацук. – Мінск, 2014.
30. Архив внешней политики Российской империи. – Ф.79. Отношения с Польшей. Оп.1. 1733 г. Д.17.
31. Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego (AZS WKL). – Warszawa, 2006. – T. 1 : Opracował H. Lulewicz.

*Паступіў 14.04.2016*

## POLOTSK CASTELLANS NICHOLAS SHEMET IN THE SOCIO-POLITICAL LIFE OF THE POLISH-LITHUANIAN COMMONWEALTH IN THE FIRST THIRD OF THE XVIII CENTURY

***A. MATSUK***

*We investigate the role and place of Nicholas Semet in socio-political life of the Polish-Lithuanian Commonwealth in the first third of the XVIII century; the detailed reconstruction of his biography is given. It is noticed that the apogee of the activity of Nikolay Semet in socio-political life of the Polish-Lithuanian Commonwealth falls at the beginning of the XVIII century, when he has been one of the leaders of "Republican" in Orsha district. It is found that this has been the impetus for his career, which has ended in the senatorial government Polotsk castellans.*

***Keywords**: Nicholas Semet, the Polish-Lithuanian Commonwealth, the senatorial government Polotsk castellans.*